Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі універсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ЧАЦВЕР 12 МАЯ 1977 г.

№ 17 (1167)

Цана 2 кап.

ПА БДУ інфармацыя

## Дагавор аб супрацоўніцтве

**У час наведвання БДУ рэктарам Сафійскага універсітэта прафесарам Благавестам Сандавым і прарэктарам прафесарам Бажэнам Ніколавым быў падпісан план навуковага і культурнага супрацоўніцтва паміж Беларускім і Сафійскім універсітэтамі на 1978—1979 гады.**

Вялікая ўвага ў ім удзяляецца сумесным даследаванням. Бакі дамовіліся аб распрацоўцы васьмі сумесных навуковых тэм.

## Кнігі— равеснікі рэвалюцыі

**«Выданні твораў У. І. Леніна ў бібліятэцы БДУ» — так называецца цікавая кніжная выстаўка, што афармлена на другім паверсе універсітэцкай бібліятэкі.**

Яна мае тры раздзелы: «Прыжыццёвыя выданні», «Даваенныя выданні» і «Мініяцюрныя выданні твораў У. І. Леніна і літаратура аб ім». У першым раздзеле прадстаўлены такія кнігі, як «Імперыялізм, як новы этап капіталізму», выдадзеная кнігавыдавецтвам «Коммунист» у 1913 годзе; зборнік артыкулаў «За 12 год», выдадзены ў 1918 годзе і падпісаны адным з псеўданімаў У. І. Леніна — Ул. Ільін і іншыя кнігі.

У другім раздзеле выстаўкі ўвагу прыцягваюць кнігі вялікага правадыра, перакладзеныя на беларускую мову.

## Ветэраны расказваюць

**Напярэдадні Дня Перамогі байцы будаўнічага атрада «Сузор'е» — студэнты факультэта прыкладной матэматыкі наведалі сяло Строчыцы Шчомыслiцкага сельсавета.**

Яны сустрэліся з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны К. К. Паланевічам і К. А. Канановічам. Ветэраны, а зараз працаўнікі калгаса «Шлях да камунізму» расказалі студэнтам аб сваім баявым шляху, аб мясцінах, дзе ваявалі, аб баявых сябрах. Расказы былых воінаў і фотаздымкі ўвойдуць у альбом, які афармляюць байцы атрада.

## Памятная сустрэча

**У канцы красавіка на філфаку адбылася сустрэча студэнтаў з брэтам Якуба Коласа Іосіфам Міхайлавічам Міцкевічам.**

Іосіф Міхайлавіч, нягледзячы на 83-гадовы ўзрост, валодае выдатнай памяццю. Ён напамяць ведае ўсю паэму «Новая зямля». Іосіф Міхайлавіч расказаў студэнтам пра гісторыю стварэння паэмы, прачытаў некалькі ўрыўкаў з яе, апавяданне з трылогіі «На ростанях», вершы.

Сустрэча з Іосіфам Міхайлавічам запомніцца надоўга тым, хто любіць і вывучае літаратурную спадчыну вялікага беларускага песняра Якуба Коласа.

А. НОВІКАЎ,
слухач падрыхтоўчага аддзялення.

# ПАСТАНОВА

**бюро камітэта камсамола і прэзідыума прафкома Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна «Аб мерах па далейшаму дасканаленню правядзення сацыялістычнага спаборніцтва паміж акадэмічнымі групамі пад дэвізам «Ніводнага адстаючага побач!».**

Выступаючы на Усесаюзным злёце студэнтаў, Генеральны сакратар ЦК КПСС Л. І. Брэжнеў даў дакладнае і глыбокае азначэнне паняцця «сучасны спецыяліст». «Савецкі спецыяліст сёння — гэта чалавек, які добра авалодаў асновамі марксісцка-ленінскага вучэння, ясна бачыць палітычныя мэты партыі і краіны, мае шырокую навуковую і практычную падрыхтоўку, у дасканаласці валодае сваёй спецыяльнасцю.

Савецкі спецыяліст сёння — гэта разумны арганізатар, здольны на практыцы прымяніць прынцыпы навуковай арганізацыі працы. Ён умее працаваць з людзьмі, цэніць калектыўны вопыт, прыслухоўваецца да думак таварышаў, крытычна ацэньвае дасягнутае.

І канешне, сучасны спецыяліст — гэта чалавек высокай культуры, шырокай эрудыцыі, наогул, гэта сапраўдны інтэлігент новага, сацыялістычнага грамадства».

У падрыхтоўцы такіх спецыялістаў істотнае значэнне мае сацыялістычнае спаборніцтва пад лозунгам «Ніводнага адстаючага побач!», якое разгарнулася ў ходзе вывучэння матэрыялаў XXV з'езда КПСС.

1 красавіка 1976 года ва універсітэцкай шматтыражцы «Беларускі універсітэт» была апублікавана пастанова бюро камітэта камсамола універсітэта «Аб разгортванні сацыялістычнага спаборніцтва пад дэвізам «Ніводнага адстаючага побач!» у камсамольскай арганізацыі універсітэта».

У чэрвені былі апублікаваны новыя ўмовы правядзення сацыялістычнага спаборніцтва, улічваючыя задачы агляду-конкурсу ў святле лозунга «Ніводнага адстаючага побач!». Вынікі спаборніцтва падводзіліся агульнауніверсітэцкай камісіяй, зацверджанай рэктаратам універсітэта. Пытанні ходу сацыялістычнага спаборніцтва заслухоўваліся на рэктарацe, бюро камітэта камсамола і прэзідыуме прафкома універсітэта. Ва ўсіх камсамольскіх групах у снежні 1976 года былі праведзены камсамольскія сходы з парадкам дня «Ніводнага адстаючага побач! Што ты для гэтага зрабіў, камсамолец?»

Спаборніцтва пад гэтым лозунгам садзейнічала паляпшэнню стану спраў у групах, ва універсітэце. 1369 студэнтаў-камсамольцаў займаюцца толькі на «выдатна», 4194 на «выдатна» і «добра». За 1975-76 навучальны год колькасць груп са 100-працэнтнай паспяховасцю павялічылася са 164 да 186. Павысілася грамадска-палітычная актыўнасць студэнтаў.

Разам з тым яшчэ каля 600 студэнтаў маюць нездавальняючыя адзнакі. Хаця адным з важнейшых паказчыкаў вучэбна-выхаваўчай работы груп па ўмовах агляду, зацверджаных бюро камітэта камсамола універсітэта ў маі 1976 года, з'яўляецца работа з адстаючымі студэнтамі, больш 190 студэнцкіх груп церпяць у сваіх радах «двоечнікаў». У той жа час на кожнага непаспяваючага студэнта прыходзіцца больш дзесяці студэнтаў-камсамольцаў, паспяваючых на «выдатна», на «выдатна» і «добра». Усё яшчэ не ўсе рэзервы павышэння паспяховасці выкарыстоўваюцца ў студэнцкіх групах. Каля 700 студэнтаў не прымаюць актыўнага ўдзелу ў грамадскім жыцці сваіх калектываў.

Акрамя таго, у ходзе сацыялістычнага спаборніцтва некаторыя камітэты камсамола і прафбюро ўдзяляюць недастаткова ўвагі здзяйсненню найважнейшых прынцыпаў сацыялістычнага спаборніцтва — галоснасці, нагляднасці і параўнальнасці паказчыкаў. Не на ўсіх факультэтах умовы сацыялістычнага спаборніцтва даведзены да кожнай групы, не створаны абставіны здаровага супернічання, не заключаліся двухбаковыя пагадненні паміж групамі ў перыяд правядзення камсамольскіх сходаў з парадкам дня «Ніводнага адстаючага побач! Што ты для гэтага зрабіў, камсамолец?»

Стэнды не заўсёды адлюстроўваюць ход спаборніцтва і сапраўднае становішча спраў на факультэце. Слаба адлюстроўваецца дынаміка спаборніцтва, паказчыкі не заўсёды адпавядаюць задачам спаборніцтва. Ва ўмовах агляду не ўлічваюцца спецыфіка розных курсаў, тэрміны падвядзення вынікаў, сістэма нагляднага адлюстравання ходу спаборніцтва, меры заахвочвання.

Зыходзячы з вышэй выкладзенага, бюро камітэта камсамола і прэзідыум прафкома пастанаўляюць:

1. Прадоўжыць сацыялістычнае спаборніцтва паміж акадэмічнымі групамі пад лозунгам «Ніводнага адстаючага побач!». У 1976-77 навучальным годзе прысвяціць яго 60-годдзю Вялікага Кастрычніка.

(Заканчэнне на 3-й стар.)

# УВАГУ—ПАСПЯХОВАСЦІ

**Камітэт камсамола Белдзяржуніверсітэта сумесна з аддзелам студэнцкай моладзі абласнога камітэта ЛКСМБ правялі навукова-практычную канферэнцыю «Формы і метады работы камсамольскіх арганізацый ВНУ па павышэнню паспяховасці студэнтаў», якая была прысвечана 60-годдзю Вялікага Кастрычніка. На канферэнцыі прысутнічалі студэнты БПІ, БДІНГ імя Куйбышава, БТІ імя Кірава і некаторых іншых ВНУ горада Мінска. Пленарнае пасяджэнне адкрыў А. Тозік, сакратар камітэта камсамола універсітэта. З дакладам «Галоўныя напрамкі работы камсамольскіх арганізацый ВНУ па павышэнню паспяховасці студэнтаў» выступіў загадчык аддзела студэнцкай моладзі абласнога камітэта ЛКСМБ С. Пагарэлаў. Ён расказаў аб рабоце, якую праводзяць камітэты камсамола ВНУ горада па павышэнню паспяховасці, аб ходзе сацыялістычнага спаборніцтва «Ніводнага адстаючага побач!», аб дзейнасці вучэбна-выхаваўчых камісій, спыніўся на недахопах.**

Канферэнцыя прадоўжыла работу па трох секцыях: арганізацыя і правядзенне сацыялістычнага спаборніцтва паміж камсамольскімі арганізацыямі акадэмічных груп, формы і метады работы вучэбна-выхаваўчых камісій, формы і метады работы камсамольскіх арганізацый ВНУ з першакурснікамі. Перад прысутнымі выступіла 18 чалавек. З вялікай цікавасцю былі выслуханы даклады В. Васпяковай, В. Рошчына, І. Харунжага, Л. Валюк, Я. Іванова і некаторых іншых.

А. ЦЫБУЛЬКА.



**НА ЗДЫМКАХ:** выступае загадчык аддзела студэнцкай моладзі Мінскага АК ЛКСМБ С. ПАГАРЭЛАЎ (злева); намеснік сакратара камітэта камсамола юрыдычнага факультэта В. ВАСПЯКОВА; у зале канферэнцыі.

Фота аўтара.








СБА імя Ленінскага камсамола на БАМе.

# ЯК НАВУЧЫЦЦА СЯБРАВАЦЬ?

...Дзень быў не з лёгкіх, і байцы адпачывалі.

Раптоўна дзверы барака ўдарыліся аб вушак. Забрынчэла шкло. Нехта з дзяўчат шмыгнуў за заслону.

— Здарова, дамачкі!

Група ўсміхаючыхся хмяльных хлопцаў шумліва прайшла ў пакой і ўселася на ложак. Адзін з «гасцей» нават лёг.

— Чаго стаіш, кучаравая, садзіся,— шырокім жэстам указаў сабе на калені.

— Рабяты, калі ласка, ідзіце адсюль. Нам трэба адпачываць.

— Як гэта — ідзіце? Мы — госці!

— Няпрошаныя!

— Не цырымонься з імі, Галка. Выганім і ўсё.

— Хто тут хоча нас выгнаць? Ты, рыжая, гавары, ды не загаворвайся...

— Прыходзьце, рабяты, заўтра днём.— узмалілася камісар.— Мы ў клубе канцэрт будзем даваць.

— А ты мне зараз канцэрт пакажы. «По-да-ри мне платок, га-лу-бой лас-ка-ток...»

Далей можна не працягваць. Як уціхамірылі і выправадзілі хлопцаў, няясна. Хутчэй за ўсё, тыя давялі дзяўчат да слёз і пайшлі далёка за поўнач, калі саміх пацягнула на сон. Настрой назаўтра ў байцоў быў сапсаван.

Гэту карціну — прычым без згушчэння фарбаў — можна было назіраць у мінулым годзе. Да ці мала ў якім СБА універсітэта яе можна было назіраць! «Расстаноўка сіл» больш чым ясная: з аднаго боку — байцы СБА, у асноўным дзяўчаты, з другога — мясцовая «гвардыя». Тыя і другія з аднаго лагера, імя якому моладзь. А вось пасябраваць паміж сабою не змаглі.

Скажу адразу, канфліктныя сітуацыі такога парадку — з'ява зусім не абавязковая. Можна прывесці сотні прыкладаў, калі байцы цудоўна супрацоўнічаюць з вясковымі школьнікамі, маладымі механізатарамі, мясцовымі жыхарамі. «Тут нам жыць,— сказаў неяк адзін з камандзіраў, — і не важна, што жыць усяго два месяцы».

Але чаму ў адных выпадках атрымліваецца, а ў іншых — не? Якія «цёмныя сілы» перашкаджаюць устанаўленню ўзаемна цікавага, дружалюбнага кантакту атрад — вясковая моладзь?

Некаторыя атрады трывожылі ў асноўным па нядзельных днях, калі з горада дадому прыязджала дзесятак маладых рабочых. Трывожылі чаму? У клубе — сумна, дома — усё гатовае. Ідзе група па вясковай вуліцы. У яе няма ніякіх злых намераў, але няма і заняткаў, справы ці проста забавы.

І ўсё ж такі іх жаданне пазнаёміцца заканамернае. Чалавеку ўласціва цягнуцца да новага. Але гэтыя «госці» вядуць сябе выклікаюча — яны не ведаюць, як сябе весці ў такой сітуацыі. Плюс звычка рабіць усё з аглядкай на дружкоў. Дапамагчы байцам адрамантаваць лаўку? Дык засмяюць жа «сабрацці»! Так і атрымліваецца, што дрэнных намераў тут няма. Ёсць хваробы росту, унутраныя пошукі, магчыма, і несвядомыя. На жаль, у многіх выпадках гэтыя пошукі заканчваюцца нічым.

З боку атрада справа абстаіць па-іншаму. На першы погляд — дзяўчаты нікольні не павінны ў тым, што кантакт з мясцовай моладдзю не адбыўся. Паспрабуйце самі, змоўцецеся з такімі, скажа тая ж самая Галка. Яна ставіцца да «гасцей» як да варожых тыпаў. Знешнія прыкметы ў наяўнасці: уваліліся на атрадную тэрыторыю, кураць, гавораць непрыстойнасці. Але вось першы лядок зломлен. Днём, убачыўшы тых жа самых хлопцаў у будаўнічых абставінах, цвярозых, працавітых, байцы разумеюць: перад імі такія ж хлопцы, як і яны самі. А далей нічога не вынікае. Зноў вечар — зноў сваркі. «Мы іх не чапаем,— гавораць будатрадаўцы. — Чаму яны да нас лезуць?» Фармальна ўсё правільна. Чалавеку ахвота з аднымі сябраваць, а з іншымі — не. Але тут не сума маладых людзей, тут — атрад, баявая адзінка. А вось баявітасці і няма. Баявітасці не петушынай, а здаровай, дзелавой.

Быць адказным за даручаную справу і быць адказным за сябе — гэта не адно і тое ж. Пытанне паскарэння развіцця сацыяльна - маральнай свядомасці маладых людзей даўно пастаўлена на парадак дня. Але ці магчыма дабіцца вынікаў, калі рабяты самі не ўсведамляюць усю згубнасць «ваджэння па жыццю за руку», па іх уласнаму жыццю?

Атраду выпадзе здаваць шмат экзаменаў. Адзін з іх— узаемаадносіны з мясцовымі жыхарамі. Адзнака ідзе ў атэстат грамадзянскай сталасці.

С. ШЫДЛОЎСКАЯ.

# ФОРМУЛА ЗАКАНАМЕРНАСЦІ

Падрыхтоўчы перыяд дзейнасці СБА — падмурак працоўнага семестра. Ад якасці, сур'ёзнасці яго правядзення залежыць тое, наколькі будзе вытрымана выпрабаванне працай як асобным байцом у прыватнасці, так і лінейным або зводным атрадам у цэлым. Гэта ўжо аксіёма, знявага якой заўжды не марудзіць сказацца парушэннямі прынцыпаў дзейнасці СБА, невыкананнем вытворчых планаў або, яшчэ горш, амаральнымі паводзінамі, што мяжуюць з непрыкрытай меркантыльнасцю.

Сёння такія рэцэдывы старой «хваробы» асобных камандзіраў і камісараў (маўляў, працоўны перыяд пакажа, на што мы здольныя)—нельга разглядаць як выпадковасць. Яны выкліканы абыякавымі адносінамі да падрыхтоўчай дзейнасці.

Сацыялістычнае спаборніцтва, творча і па-дзелавому праведзенае ў падрыхтоўчым перыядзе,— вось найлепшая прафілактыка гэтай «хваробы», надзейная гарантыя поспеху, формула яго заканамернасці. Год ад году ўдасканальваецца, прымае якасна новыя формы спаборніцтва паміж атрадамі ў камсамольскай арганізацыі БДУ. Зыходзячы з галоўных патрабаванняў да дзейнасці студэнцкіх будатрадаў як школы працоўнай і фізічнай загартоўкі, прынцыпаў і першарадных задач, абумоўленых характарам і асаблівасцямі сучасных будоўляў, камітэт камсамола імкнецца зрабіць так, каб агульнабудаўнічы рух стаў непасрэднай кроўнай справай кожнага камсамольца — удзельніка гэтага руху.

Умовамі спаборніцтва, якое ўжо набыло творчую сілу і размах, прадугледжан улік работы па асноўных напрамках не толькі лінейных СБА, але і факультэтаў, якія іх фарміруюць. Гэта дазваляе павысіць адказнасць камандзіраў і камісараў у правядзенні мерапрыемстваў падрыхтоўчага перыяду, узмацніць кантроль за дзейнасцю атрадаў з боку камсамольскіх бюро факультэтаў.

З мэтай дакладнага ўліку таго, што зроблена ў падрыхтоўчым перыядзе, распрацавана і даведзена да ведама ўсіх аптымальная сістэма ацэначных балаў, па якой пры падвядзенні вынікаў у сярэдзіне чэрвеня будуць вызначаны пераможцы — атрады і факультэт.

Момант такой арганізацыі спаборніцтва выявіўся ў тым, што ў тэрмін, з захаваннем усіх прынцыпаў, ва універсітэце сфарміравана 57 лінейных СБА, узначаленых тымі, хто закончыў школу камандзіраў і камісараў.

Знамянальна, што ў час правядзення працоўных дэсантаў нарадзіліся добрыя пачынанні. Так, байцы атрада «Іскра» факультэта прыкладной матэматыкі, якія дапамагалі будаўнічаму трэсту № 7 г. Мінска ўзводзіць новы Палац піянераў, звярнуліся да ўсіх удзельнікаў студэнцкага будаўнічага руху з заклікам «Кожнаму байцу СБА — адпрацаваць адзін дзень на будаўніцтве Палаца піянераў!». А атрад «Праметэй» гэтага ж факультэта выступіў ініцыятарам пачыну «На студэнцкую будоўлю — без тройкі!»

Камітэт камсамола, штаб працоўных спраў універсітэта вырашылі, што ў дзень камуністычнага суботніка ўсе байцы атрадаў БДУ будуць працаваць на будаўнічай пляцоўцы Мінскага Палаца піянераў.

Адзін з лепшых СБА — атрад «Буравеснік» імя В. І. Казлова філалагічнага факультэта ўжо ў чацвёрты раз выступіў з канцэртам перад рабочымі і школьнікамі горада.

Ва універсітэце шырока разгарнулася лекцыйна-прапагандысцкая работа.

Размах спаборніцтва, якое праходзіць пад знакам 60-годдзя Вялікага Кастрычніка, выліўся ў творчы энтузіязм, жаданне зрабіць так, каб побач не было ніводнага адстаючага. Гэта — сённяшні пароль камсамольцаў універсітэта.

В. РОШЧЫН,
кіраўнік прэс-цэнтра камітэта камсамола БДУ.

**Няммога часу засталося да пачатку трэцяга працоўнага семестра. Пройдзе крыху больш месяца, і будаўнічыя пляцоўкі дзесятай пяцігодкі зноў прымуць хлопцаў і дзяўчат у форме байцоў СБА. Гэтая старонка прысвячаецца ім — удзельнікам будучага і мінулага працоўных семестраў.**

# ЛЕТА ПАЧЫНАЕЦЦА ВЯСНОЙ

У поўным разгары зараз падрыхтоўка да трэцяга працоўнага семестра ў кожным з лінейных СБА. Адны рыхтуюцца да ўмоў работы ў Сібіры, другія паедуць у Казахстан, трэція — у нечарназёмную зону РСФСР...

— А мы, байцы атрада «Кастрычнік», застанёмся будаваць тут, на роднай беларускай зямлі. Нашы рабяты будуць узводзіць жывёлагадоўчы комплекс у калгасе «Кастрычнік», што ў Клецкім раёне Мінскай вобласці», — гаворыць камандзір атрада фізічнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна Т. С. Працько.

Таццяна Сяргееўна, інжынер кафедры паўправаднікоў, вось ужо тры гады, як скончыла фізічны факультэт, тады ж уступіла ў рады КПСС, але, па яе ўласных словах, яна, як і раней, у студэнцкім страі. Другі год запар узначальвае СБА фізфака.

— Вопыт паказвае, — працягвае камандзір, — што вельмі важна, каб рабяты, адпраўляючыся разам па дарогах трэцяга працоўнага семестра, не адчувалі сябе «незнаёмцамі». Наш атрад складаюць у асноўным студэнты другога і трэцяга курсаў. Многія з трэцякурснікаў ужо працавалі ў СБА, але большасць байцоў цяперашняга «Кастрычніка» — навічкі ў студэнцкай будаўнічай сям'і. Таму неабходна ўжо цяпер стварыць сяброўскі, згуртаваны калектыў — сплаў, як гаворыцца, маладосці і вопыту...

Планам падрыхтоўчага перыяду СБА «Кастрычнік» прадугледжаны мерапрыемствы, садзейнічаючыя рашэнню гэтай нялёгкай задачы. Яшчэ ў сакавіку на першым сходзе атрада было вырашана правесці некалькі працоўных дэсантаў на будаўнічых аб'ектах Мінска, каб лепш даведацца адзін аб адным у працы. Камуністычны суботнік на будаўніцтве новага Палаца піянераў, тры дні работы ў мікрараёне «Чыжоўка-3» па падрыхтоўцы да здачы ў эксплуатацыю 192-кватэрнага жылога дома дапамаглі гэтаму.

— Карысць ад такіх мерапрыемстваў вялізная,—працягвае Таццяна Сяргееўна. — Большасць рабят працавала з вялікай стараннасцю, але былі і такія, што спасавалі перад цяжкасцямі, пайшлі з атрада. Добра, што гэта здарылася зараз, у перыяд падрыхтоўкі да нашага асноўнага экзамена. А галоўны вынік работы гэтых дэсантаў у тым, што наш студэнцкі працоўны калектыў нарадзіўся непасрэдна ў працы.

Сёння фонд СБА «Кастрычнік» налічвае каля 250 рублёў, заробленых самімі байцамі. Зараз частка рабят займаецца на курсах муляраў, бетоншчыкаў. Агітбрыгада атрада па выніках факультэцкага конкурсу адзначана ў ліку лепшых. Адным словам, «Кастрычнік» жыве цікавым, поўным клопатаў жыццём. Працоўнае студэнцкае лета пачалося для яго байцоў яшчэ ранняй вясной, а гэта цвёрдая гарантыя будучага працоўнага поспеху.

С. МАКСІМАЎ.



Выступае атрадная агітбрыгада.



**Мікалай Фаменка і Юрый Капран займаюцца на першым курсе вячэрняга аддзялення фізфака. Яны праявілі сябе як старанныя студэнты. Актыўна ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці, паспяхова здалі першую сесію. Юрый прыйшоў на фізфак са стажам работы ў інстытуце электронікі АН БССР, дзе ён і зараз працуе старшым лабарантам. Мікалай Фаменка стаў студэнтам адразу пасля школы. Зараз ён паспяхова спалучае вучобу з работай тэхніка ў інстытуце цепла- і масаабмену.**

**НА ЗДЫМКУ: Мікалай Фаменка і Юрый Капран у час практычных заняткаў у лабараторыі механікі і малекулярнай фізікі.**

**В. ПЛАТНІЦКІ.**
**Фота аўтара.**

# ПАСТАНОВА

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).**

2. Вынікі універсітэцкага агляду-конкурсу падвесці да 10 верасня 1977 года. Пры падвядзенні вынікаў асаблівую ўвагу звярнуць на якасныя змены ў паспяховасці, грамадска-палітычнай актыўнасці студэнцкіх калектываў. Матэрыялы, характарызуючыя дзейнасць лепшых груп факультэта, прадставіць у камісію па ўстаноўленай форме да 5 верасня.

3. Камітэтам камсамола і прафбюро факультэтаў аформіць экраны ходу сацыялістычнага спаборніцтва такім чынам, каб найбольш поўна адлюстраваць ход спаборніцтва, дынаміку работы груп, поспехі і недахопы ў рабоце груп у кожны даны перыяд.

4. Прамежкавыя вынікі падводзіць дыферэнцыявана па курсах. Асаблівую ўвагу ўдзяляць спаборніцтву груп першых курсаў.

5. Камітэтам камсамола і прафбюро аформіць на факультэтах стэнды, адлюстроўваючыя вопыт работы лепшых груп факультэтаў. Практыкаваць рэгулярныя выступленні, абмен вопытам лепшых груп з усімі групамі, якія ўдзельнічаюць у спаборніцтве.

6. Камітэтам камсамола і прафбюро з мэтай пастаяннага кантролю за ходам сацыялістычнага спаборніцтва праводзіць кантрольныя праверкі бягучай паспяховасці і наведвае масці, вынікі якіх рэгулярна заносіць у «Экран ходу сацыялістычнага спаборніцтва» і ўлічваць пры падвядзенні прамежкавых вынікаў.

7. Камітэтам камсамола і прафбюро факультэтаў рэгулярна заслухоўваць на сваіх пасяджэннях камсамольскі і прафсаюзны актыў па пытаннях удзелу групы ў аглядзе-конкурсе, павышэння паспяховасці, якасці падрыхтоўкі будучых спецыялістаў, аказання персанальнай дапамогі адстаючым студэнтам, стварэння ў групе абстаноўкі супрацоўніцтва і ўзаемадапамогі.

8. На сумесным пасяджэнні бюро камітэта камсамола універсітэта і прэзідыума прафкома ў верасні 1977 года разгледзець пытанне «Аб выніках сацыялістычнага спаборніцтва пад лозунгам «Ніводнага адстаючага побач!» у 1976-77 навучальным годзе і задачах камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый акадэмічных груп універсітэта».

9. Вучэбна-навуковаму аддзелу камітэта камсамола і вучэбна-вытворчай камісіі прафкома універсітэта правесці прэс-канферэнцыю актыву лепшых акадэмічных груп універсітэта па выніках 1976-77 навучальнага года з камсамольскім і прафсаюзным актывам груп універсітэта ў кастрычніку—лістападзе 1977 года.

10. Вучэбна-вытворчай камісіі прафкома і вучэбна-навуковаму аддзелу камітэта камсамола універсітэта па выніках летняй сесіі і агляду-конкурсу аформіць стэнд «Імянныя стыпендыяты і лепшыя акадэмічныя групы універсітэта».

11. Прэзідыуму прафкома рашыць пытанне аб узнагароджанні лепшых акадэмічных груп па выніках агляду-конкурсу турысцкімі паездкамі па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа.

12. Кантроль за выкананнем данай пастановы ўскласці на вучэбна-навуковы аддзел камітэта камсамола і на вучэбна-вытворчую камісію прафкома універсітэта.

**Бюро камітэта камсамола, прэзідыум прафкома БДУ.**

# СПРАВЫ ПАЛЯЎНІЧЫЯ




Прайшла зіма. Адгрымелі паляўнічыя стрэлы, не чутна ў лесе прызыўнага рога. Паляўнічы сезон скончыўся. Для адных ён быў паспяховы, з «пухам і пер'ем», другія набылі ў якасці трафеяў новыя серыі невычарпальных паляўнічых здарэнняў. І, вядома, на ўсіх хапіла незабыўных уражанняў ад сустрэч з нашай прыгажуняй-прыродай. Сезон прайшоў, а клопаты засталіся. Аб тым, у якім стане знаходзяцца справы ў таварыстве паляўнічых і рыбаловаў Белдзяржуніверсітэта, я папрасіў расказаць яго нязменнага старшыню В. Клімава.

**— Віктар Фёдаравіч, ці многа паляўнічых і рыбаловаў ва універсітэце?**

— У таварыстве паляўнічых і рыбаловаў БДУ стаяць на ўліку 81 паляўнічы і 23 рыбаловы. Амаль палову з іх складаюць супрацоўнікі універсітэта. У асноўным гэта людзі, захопленыя сваёй справай: любяць прыроду, выдатна ведаюць свет жывёл, звычкі птушак і звяроў.

**— У апошні час аб паляванні бытуюць розныя думкі. Як вы лічыце, што яно дае людзям?**

— Пытанне аб тым, што паляванне нібыта знішчальна для прыроды, ужо знята з парадку дня. Я маю на ўвазе «разумнае» паляванне, з правільна ўстаноўленымі тэрмінамі, з упарадкаванымі нормамі адстрэлу. У той жа час у сапраўднага паляўнічага ніколі не ўзнімецца рука для таго, каб учыніць зло прыродзе.

Паляванне выпрацоўвае ў людзей дысцыплінаванасць, настойлівасць, мужнасць— якасці, самыя неабходныя ў жыцці. Захапленне паляваннем прымушае больш рацыянальна адносіцца да свайго вольнага часу, не траціць яго дарэмна, размяркоўваць так, каб можна было ўдзяліць увагу любімаму занятку. Асабіста я ніводнага выхаднога дня не сядзеў дома. А тое, што часцяком вяртаўся з пустымі рукамі, нікольні не адчайвала. Пасля кожнай такой паездкі заўсёды адчуваецца непамерны прыліў творчых сіл.

**— У якім стане знаходзіцца пытанне аб наяўнасці ўласных паляўнічых угоддзяў?**

— БДУ—установа паважаная і не бедная, а вось паляўнічых угоддзяў у нас няма. Калі прыняць пад увагу тое, што ў нас існуюць факультэты прыродазнаўчых навук, то гэтыя ж угоддзі маглі б стаць вучэбнай базай для навуковых назіранняў за флорай і фаунай. Людзі для такой справы знайшліся б. Аснову нашага таварыства складаюць такія вопытныя паляўнічыя, як В. Бабкоў, Б. Валеўскі, М. Гадыцкі, А. Фядосаў, А. Астапеня, Я. Карашкоў, А. Нікіцёнак. Яны вялікія знаўцы паляўнічай навукі, заўсёды гатовы падзяліцца ведамі з пачаткоўцамі. Выдатнай школай для будучых прыродазнаўцаў з'яўляецца работа студэнтаў-біёлагаў у групе інспекцыі факультэта пад кіраўніцтвам А. Фядосава.

**— Вы сказалі, што частка паляўнічых таварыства не з'яўляюцца супрацоўнікамі універсітэта. Хто ж яны?**

— У першую чаргу гэта студэнты, якія скончылі вучобу, але засталіся на ўліку ў нашай арганізацыі, так як не ўсе прадпрыемствы маюць пярвічныя паляўнічыя калектывы. Па гэтай жа прычыне некаторую колькасць паляўнічых за намі замацоўвае гарадскі савет БГПР. Безумоўна, што частка гэтых членаў не зацікаўлена ў рашэнні нашых праблем, і ўся іх дзейнасць зводзіцца ўсяго толькі да выплаты ўзносаў.

**— У чым выражаецца дапамога універсітэта паляўнічаму таварыству?**

— Патрэбнасці нашы невялікія. Мясцовы камітэт універсітэта заўсёды падтрымліваў нашы калектыўныя выезды на паляванне і рыбалку. У мінулую зіму мы таксама намецілі правесці спаборніцтва па падлёднай лоўлі, але для такога мерапрыемства не знайшлося... бензіну. Крыўдна, што кіраўнікі адміністрацыйна - гаспадарчай часткі не праявілі належнай чуласці, не пайшлі нам насустрач.

**— І апошняе пытанне. Хто можа стаць членам таварыства паляўнічых і рыбаловаў?**

— Уступіць у наша таварыства можа кожны, незалежна ад таго, студэнт гэта ці штатны работнік універсітэта. Дастаткова прайсці гадавы кандыдацкі стаж, а рыбаловы могуць запісацца ў любы момант і без стажу. Але ў апошні час у сувязі з памяншэннем паляўнічых угоддзяў прыём у таварыства абмежаван. У гэтым годзе толькі 100 чалавек у Мінску могуць уступіць у паляўнічыя калектывы. Нашай жа арганізацыі выдзелена ўсяго два месцы. Іх зоймуць самыя дастойныя.

**М. БАСАЎ,**
**студэнт II курса факультэта журналістыкі.**

# АДДАНАСЦЬ НАРОДНАЙ МУЗЫЦЫ

**Цёплымі апладысментамі сустракалі гледачы выступленне харавой капэлы філалагічнага факультэта БДУ на агульнауніверсітэцкім аглядзе-конкурсе, прысвечаным 60-годдзю Вялікага Кастрычніка.**

**Створаны параўнальна даўно, гэты калектыў па праву лічыцца адным з лепшых у БДУ. Кіруе калектывам кампазітар В. Шуровіч — член Саюза кампазітараў БССР.**

**Частыя паездкі па Беларусі даюць яму багаты матэрыял з невычэрпных крыніц беларускай народнай музыкі. І не выпадкова, што аснову рэпертуара складаюць беларускія народныя песні.**

**В. Шуровіч патрабавальны да чысціні і музычнага хараства кожнай харавой партыі свайго калектыву. Фактычна ўсе аранжыроўкі і партытуры песень, выконваемых капэлай, належаць яе кіраўніку.**

**У саставе хору — студэнты ўсіх курсаў, усяго больш 100 чалавек. Рэпетыцыі заўсёды праходзяць цікава, што ў многім прыцягвае рабят у хор.**

**Журы высока ацаніла выступленне харавой капэлы філфака на агульнауніверсітэцкім аглядзе-конкурсе. Хочацца пажадаць калектыву харавой капэлы філфака новай творчай работы над сваім рэпертуарам, над павышэннем свайго прафесіянальнага майстэрства, каб прыносіць эстэтычную асалоду ўсім аматарам беларускай народнай музыкі.**

**Ю. ЮРКЕВІЧ.**

**НА ЗДЫМКУ: выступае харавая капэла філфака.**

**Фота аўтара.**



# ТРЭЦІМ РАЗАМ— ЛЕПШЫМ ЧАСАМ

Завяршылася першынство універсітэта па футболу. У спаборніцтвах прымалі ўдзел зборныя каманды 10 факультэтаў і каманда радыёфізікаў, якія былі разбіты на 2 групы. Мацнейшымі ў першай групе былі калектывы фізікаў і хімікаў, а ў другой—спартсмены факультэта журналістыкі і ФПМ. Гэтыя зборныя і разыгралі чатыры першыя месцы, а астатнія—5-е—11-е.

Яўных лідэраў у фінальнай групе не было. Цікавай, рэзультатыўнай гульні чакалі ад мінулагодніх чэмпіёнаў—фізікаў, але яны выступілі слабавата. Абедзве фінальныя гульні фізікі закончылі нулямі. Не прапусцілі, але і не забілі ніводнага мяча. Прыкладна роўныя саставы выставілі хімікі і журналісты. Слабей выглядала каманда ФПМ.

Апошні дзень спаборніцтваў. Апошняя, 32-я па ліку сустрэча фізфак— журфак. Хімікі, забіўшы на апошніх хвілінах 2 галы зборнай ФПМ, сталі балельшчыкамі журфака. Калі выйграюць журналісты, колькасць ачкоў у іх стане аднолькавай, і хімікі—чэмпіёны (так як у гульні паміж сабой перамога была на баку хімфака). Таму кожную атаку журфакаўцаў яны дружна віталі. Але ўпарты паядынак закончыўся ўнічыю.

Такім чынам, фізікі зноў сталі чэмпіёнамі. На другім месцы спартсмены хімічнага факультэта, на трэцім—журфакаўцы.

Пасля заканчэння чэмпіяната я папрасіў Віталія Данілавіча Ліштвана, трэнера зборнай БДУ па футболу і галоўнага суддзю першынства, падвесці некаторыя вынікі.

— Чэмпіянат парадаваў. Усе гульні праходзілі ў бескампраміснай, па-спартыўнаму ўпартай барацьбе. Гэта быў і перадапошні этап падрыхтоўкі футбалістаў зборнай універсітэта да студэнцкага першынства нашай рэспублікі. Каманды беларускіх ВНУ падзелены на дзве зоны. Гульні нашай зоны адбудуцца з 11 па 17 мая ў Віцебску.

**В. ФІЛІПЧЫК.**



**НА ЗДЫМКУ: адзін з момантаў спаборніцтваў.**

**Фота А. БАСАВА.**

# СПОРТ

## Для тых, каго вабіць турызм

15 мая 1977 года спартыўны клуб БДУ імя У. І. Леніна і турысцкія клубы ФПМ і хімфака арганізуюць масавы паход выхаднога дня для здачы норм ГПА і прапаганды турызму сярод студэнтаў, супрацоўнікаў і выкладчыкаў універсітэта.

Усіх, хто хоча бліжэй пазнаёміцца з родным краем, паслухаць турысцкія песні, паспрабаваць сапраўднага турысцкага чаю, чакаем 15 мая 1977 года ў 7 гадзін 40 мінут каля геаграфічнага корпуса БДУ. Пры сабе мець невялікі рукзак (можна адзін на некалькі чалавек), у які ўкласці:

1) запасныя кеды (тапачкі) і наскі;

2) цёплую куртку;

3) сухі паёк для абеду;

4) грошы для праезду да месца выхаду на маршрут і назад.

Групы павядуць інструктары вопытныя і не зусім вопытныя, але надзейныя.

Пералік 25 маршрутаў, прозвішчы інструктараў будуць паведамлены на факультэтах 12 мая 1977 года.

**Спортклуб БДУ, турклуб ФПМ і хімфака.**

## ВЫЙШЛІ Ў ФІНАЛ

У спартыўнай зале універсітэта праходзіла занальнае першынство Белсавета СДСТ «Буравеснік» па баскетболу сярод жанчын. У спаборніцтвах прымалі ўдзел пяць каманд: БДУ, БПІ, Мінскага інстытута культуры, Брэсцкага інжынерна-будаўнічага і Магілёўскага педагагічнага інстытутаў. Калектывы, занятшыя першыя два месцы, атрымлівалі права ўдзельнічаць у фінальным турніры.

Баскетбалісткі БДУ перамаглі ўсіх сваіх сапернікаў і ўпэўнена занялі першае месца. У першым матчы яны з лікам 77:50 перамаглі каманду інстытута культуры. Сустрэча з брэсцкімі спартсменкамі закончылася з лікам 69:20 у карысць гаспадароў пляцоўкі. З вялікай цікавасцю чакалася сустрэча паміж камандамі БДУ і Магілёўскага педагагічнага інстытута, але магіляўчанкі аказалі супраціўленне толькі ў першай палове гульні. У другім тайме наша каманда загуляла хутчэй, і як вынік—перамога з лікам 69:33. У апошняй сустрэчы нашы баскетбалісткі лёгка перамаглі каманду БПІ.

Рыхтаваў каманду БДУ да спаборніцтваў Георгій Міхайлавіч Грудо, які ўжо не адзін год працуе з баскетбалісткамі універсітэта.

Найбольшы ўклад у перамогу каманды ўнеслі такія вопытныя ігракі, як Анікіна, Жабінская, Гузняк, якія набіралі ў кожным матчы найбольшую колькасць ачкоў і вялі за сабой партнёраў.

Другую пуцёўку ў фінал заваявалі баскетбалісткі Магілёўскага педагагічнага інстытута.

22 мая ў Мінску пачнецца фінал першынства СДСТ «Буравеснік». Акрамя каманды універсітэта, у ім прымуць удзел яшчэ 7 мацнейшых каманд ВНУ рэспублікі.

Як вядома, у мінулым годзе баскетбалісткі БДУ выйшлі пераможцамі гэтых спаборніцтваў. Пажадаем жа і зараз нашым спартсменкам выступіць не горш.

**В. МАСКАЛЁЎ,**
**слухач падрыхтоўчага аддзялення.**

## НА СТАРЦЕ— СПАРТЫЎНЫЯ АРЫЕНЦІРОЎШЧЫКІ



У раёне станцыі Радашковічы былі праведзены спаборніцтвы па спартыўнаму арыентаванню на мясцовасці на першынство Белдзяржуніверсітэта. Спаборніцтвы былі прысвечаны 107-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна і 60-годдзю Савецкай улады.

Сярод спартсменаў стартавала 12 першаразраднікаў і тры кандыдаты ў майстры спорту. Цікавыя дыстанцыі былі падрыхтаваны кандыдатам у майстры спорту па арыентаванню Валерыем Зайцавым, які ўдала спалучае трэнерскую, навукова-метадычную работу са спартыўнымі выступленнямі на трасах арыентавання.

Пераможцамі X першынства універсітэта па спартыўнаму арыентаванню ў зададзеным напрамку сярод дарослых былі нашы мацнейшыя першаразраднікі студэнтка III курса механіка - матэматычнага факультэта Света Атамановіч з вынікам 54 хвіліны (5 км з 6 кп), студэнт V курса радыёфізічнага факультэта Георгій Жызнеўскі, які паказаў вельмі высокі рэзультат—48 хвілін 35 секунд (7 км з 10 кп). Сярод юнакоў лепшымі былі Міхаіл Грышчанка—студэнт I курса механіка-матэматычнага факультэта і студэнтка I курса біялагічнага факультэта Ірына Пармон. Першае месца сярод факультэтаў заваявала дружная каманда механіка-матэматычнага факультэта, якая складае касцяк зборнай каманды універсітэта. На другім месцы каманда біялагічнага факультэта, на трэцім—каманда факультэта прыкладной матэматыкі.

**В. АКІМАЎ,**
**галоўны суддзя спаборніцтваў.**

**Узнагароджваецца студэнтка III курса Т. Пармонік (верхні здымак).**



**Пастраенне ўдзельнікаў X спаборніцтваў па спартыўнаму арыентаванню.**

Рэдактар А. А. ДЗЕРАШ.

НАШ АДРАС Мінск, універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

АТ 04210 Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Зак. 771.